

## Ганна МІКЛАШЭВІЧ

***

*Радок нараджаю, як светлую споведзь,*
*Крыніцу з празрыстай святою вадою.*
*Напэўна, ён некалі зможа ўспомніць*
*Хвіліны, калі я была маладою…*

*Калі я кахала аддана і шчыра,*
*Сваё ахвяруючы сэрца і волю*
*Таму, хто цяплом абуджаў маю ліру*
*І вольныя думкі свабодаю кволіў.*

*Калі я спазнала жыцця асалоду,*
*У вочы твае зазіраючы смела.*
*Каханнем напісаных безліч мелодый*
*Табе аднаму падарыць я хацела.*

*Калі мітусня і жыццёвыя справы*
*Спрачаліся з песняй, з душой маладою,*
*Калі асалодай дурманілі травы,*
*Пачуцці сваволі не зналі спакою.*

*Радок нараджаю, як светлую споведзь…*

***

*Я сёння для сябе найлепшы госць,*
*Перабіраю летуценна фотаздымкі…*
*Пранеслася імгненна маладосць,*
*І сталасці мацней усё абдымкі…*

*Але душа трывожная жыве,*
*Кахае, любіць, у сусвет ірвецца…*
*Ды толькі ёй сяброў тых нестае,*
*Што некалі бальзам лілі на сэрца…*

*Але яны заўсёды побач, тут…*
*Дапамагаюць, як анёлы з неба…*
*Было шмат радасці, было пакут…*
*Як нестае вас, як жа вы патрэбны!*

*Малюся я за светлы супакой…*
*І ўдзячна дарагім і шчырым людзям,*
*Што хоць нядоўга крочылі са мной,*
*У памяці навек са мною будуць…*

***

*Калі было маркотна на душы,*
*І сэрцу вельмі нудна, адзінока…*
*Казалі Вы: «А вершы ты пішы…»,*
*І гэта сапраўды мне стала ўрокам.*

*І зведала я казку родных слоў,*
*Такіх пяшчотных, мілых і гаючых…*
*Жыццём я наталялася з радкоў.*
*Сум адступаў і сэрца больш не мучыў.*

*Натхнялася і ўранні, і ўначы*
*Святым, агністым,*
*цудадзейным словам…*
*І Вашы вершы — лепшыя ўрачы —*
*Лячылі далікатна, адмыслова…*
*І сёння помню шчыры той урок,*
*Калі камяк нервова сцісне грудзі,*
*Раблю да кніг, да вершаў*
*Вашых крок…*
*І гэта ўжо навек са мною будзе…*

***

*Сціплы дождж крануць баіцца плечы,*
*Сонца пацалункам песціць твар.*
*Неабдымнай далечы сінеча…*
*І бяздонне, неабсяжнасць мар.*

*Мае мары — светлая дарога.*
*Покліч зорак. Вечнае жыццё.*
*Дар святы ад неба і ад Бога.*
*Вечнага кахання пачуццё…*

*Сціплы дождж крануць баіцца плечы,*
*Сонца пацалункам песціць твар.*
*На парозе — салаўіны вечар,*
*Час надзей і невыказных мар.*

***

*У сусвет я нясу сваю мову,*
*Каб гучала і смела, і нова,*
*Каб нашчадкі мае, беларусы,*
*Вывучалі яе без прымусу.*

*Каб Радзіма мая расцвітала,*
*Цеплынёй і спагадай вітала,*
*Сакавітасцю роднага слова,*
*Шчодрым людзям сваім адмысловым.*

*І для шчасця мне многа не трэба:*
*Хай блакітам натхняецца неба,*
*Хай спявае світальнае сонца,*
*Беларусь прыгажэе бясконца!*

***

*Толькі помні, што я недзе ёсць,*
*Што кахаю я моцна і шчыра…*
*Для цябе, мо, нязваны я госць?*
*Але ж ты абудзіў маю Ліру.*

*Толькі помні, што я недзе ёсць,*
*Што жыву адзінока і ціха,*
*Недарэчная сцішана злосць,*
*Не чакаю ніякага ліха.*

*Толькі помні, што я недзе ёсць,*
*За цябе перад светам малюся,*
*Што галопам ляціць маладосць…*
*А яе я стрыножыць баюся…*

## Прызнанне

*У горадзе калі душа параніцца*
*Бязмерным шумам*
*і звычайнай мітуснёй,*
*Вясковая душу ратуе раніца,*
*Прыносіць і збавенне, і спакой…*

*Духмяны сад мяне сустрэне ветліва,*
*Дзяўчынкай прабягуся басанож.*
*Мая Радзіма, шчырая і светлая,*
*Усё тут радуе: вясёлка, хмаркі, дождж…*

*Птушыны шчэбет гаманлівы, радасны*
*Душы абудзіць тонкую струну,*
*Напоўніцца жыццё бязмежнай радасцю,*
*Бо тут сустрэну маму і радню…*

*І кубак кавы пад густою вішняю*
*З сястрою з асалодай падзялю…*
*Удзячна і Сусвету, і Усявышняму*
*За родны дом, за родную зямлю…*